# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» № 21 (верасень)*


## ПРЫСВЯЧЭННЕ Ў ПЕРШАКЛАСНІКІ



*Дзеткі з 1 «Б» класа ўжо цэлы месяц правучыліся ў школе і пра многае даведаліся. 28 верасня іх узвялі ў статус сапраўдных вучняў-першакласнікаў нашай школы. Але для гэтага выхаванцам неабходна было прайсці некалькі выпрабаванняў, вытрымаць сапраўдны "экзамен". Памочнікамі для дзетак выступілі настаўніца Наталля Аляксееўна ЛОЙКА і іх бацькі.*

*Першаклашкі праявілі кемлівасць, уменне сябраваць, увагу, смеласць і спрыт.*

*Яны справіліся з усімі іспытамі – ім прысвоена ганаровае званне «Вучань».*

*Хто ведае, можа, перад намі выступаў будучы касманаўт, прачытаў верш будучы паэт ці настаўнік, выканаў музычную кампазіцыю будучы спявак ці лекар.*

*На вас, дарагія першакласнікі, мы ўсе ўскладаем вялікія надзеі.*

**Надзея МІХАЛЁВА**

# ПАЛЁТ У ЖЫЦЦЁ

**Аднойчы мы ўсе будзем стаяць на парозе перад выбарам далейшага шляху, які стане стартавай пляцоўкай для шчаслівага будучага. Назад няма сцяжынкі, і школа выпускае нас у вялікі палёт - жыццё.**

**Што аб гэтым думаюць нашы выпускнікі, якія ўжо паспелі адчуць смак жыцця?**





**Вікторыя МІКЛУШ:**

- Я паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ). Пасля таго, як з’ездзіла на «дзень адчыненых дзвярэй», які БДУ праводзіць штогод, гэта ўстанова зачаравала мяне. Тут вельмі цікава вучыцца, вядома, ёсць і свае складанасці, але гэта не дае падставы РАЗЛЮБІЦЬ той ці іншы прадмет. Таксама, тут вельмі цёплая і сяброўская атмасфера. Дзякуючы гэтаму ў мяне з’явіліся надзейныя сябры. Нашы выкладчыкі - прафесіяналы сваёй справы, лекцыі не пакідаюць раўнадушнымі. Паступіць у БДУ было маёй мэтай, маёй марай, і, дзякуй Богу, гэтая мара ажыццявілася.

**Настасся СЛАБКО:**

- Я стала студэнткай Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова. Гэты вуз мне вельмі падабаецца: шмат мерапрыемстваў, якія спрыяць з’яўленню новых захапленняў і дапамагаюць раскрыць сябе з іншага боку. Нам такую магчымасць давалі і ў школе, але нашмат прасцей, калі на цябе глядзяць як на чысты ліст. Спачатку было не вельмі складана ў плане вучобы, так як першыя два тыдні ідзе начытка лекцый, але цяпер стала цяжэй. Вельмі шмат матэрыялу для вывучэння. Выкладчыкі патрабавальныя і строгія. Прывыкнуць да новага ладу жыцця яшчэ больш складана: нікога не ведаеш, няма да каго звярнуцца па дапамогу. Але ўсё гэта толькі па першым часе, потым адаптуешся, знаёмішся з новымі людзьмі - і становіцца цікава і весела! Я паступіла ў гэты ўніверсітэт мэтанакіравана. Я рада, што зрабіла гэты выбар. Як буду працаваць, то на 100 % даведаюся, маё гэта ці не, а цяпер застаецца вучыцца і яшчэ раз вучыцца!

**Эла КАРПОВІЧ:**

- Паступіла ў ВДМУ на фармацэўтычны фа-



культэт... Уражанні розныя… Нешта цікавае, штосьці больш цяжкае. Але не скажу, каб вельмі складана было вучыцца. Усё магчыма... Універсітэт прымушае мяне вывучыць або разабрацца ў тых прадметах, якім ў школе менш надавала ўвагі. Але чаму менавіта гэты вуз? Па прычыне абрана-

га мной напрамку: фармацэўтычны факультэт існуе не толькі ў Мінску, але і ў Віцебску. Лёс закінуў мяне ў больш далёкую ўстанову, але гэта нічуць не засмучае.



**Святлана САСКАВЕЦ:**

- Я паступіла ў Мінскі гандлёвы каледж Белкаапсаюза. Добрыя выкладчыкі, вучыцца не складана: заўсёды ёсць да каго звярнуцца па дапамогу. Студэнцкае жыццё істотна адрознае ад школьнага. Я выбрала гэту ўстанову адукацыі, таму што хацела ажыццявіць дзіцячую мару. І ў мяне атрымалася!



**Анастасія СЯМАШКА:**

- Я студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага каледжа. Толькі станоўчыя ўражанні. Добрыя выкладчыкі, шмат новых сяброў. Пакуль цяжкасці ёсць, але я думаю, што гэта толькі па першым часе, а потым ужо прывыкну. Цікавыя прадметы вывучаю, даведваюся шмат новага, развіваюся. Падабаецца мне медыцына. Гэта і выдатная магчымасць дапамагаць іншым людзям.



**Паліна ЛАПЫЦЬКА:**

- Я паступіла ў БДУІР. Уражанні самыя лепшыя! Я ні разу не пашкадавала, што абрала менавіта гэты вуз. Падабаецца абсалютна ўсё! Па-першае, мне вельмі-вельмі пашанцавала з групай. Мы сапраўды вельмі дружныя і ўсё робім разам. Адзін аднаму дапамагаем, бо добра ведаем і разумеем, што спачатку заўсёды нялёгка. Па-другое, ва ўстанове выдатныя выкладчыкі, што сапраўды хочуць, каб мы атрымалі вышэйшую адукацыю, а не проста ДЫПЛОМ аб вышэйшай адукацыі. Па-трэцяе, я за тры тыдні даведалася масу новага! І ўсё так дзіўна! Часам, вядома, трохі крыўдна, што столькі ўсяго цікавага па той жа матэматыцы не вывучаецца ў школьным курсе. Проста аказваецца, многія задачы рашаюцца нашмат прасцей, чым прадугледжваецца школьнай праграмай. І мне ў першы тыдзень так хацелася гэта ўсё расказаць, падзяліцца набытымі ведамі! А цяпер я проста сама сабе зайздрошчу. Зайздрошчу па той прычыне, што ў мяне ёсць выдатная магчымасць даведацца столькі новага і па-вар'яцку цікавага. Вучоба даецца лёгка. Усё таму, што цікава! Магу сказаць, што Аксана Мікалаеўна можа мной ганарыцца: мая першая адзнака ва ўніверсітэце была менавіта па гісторыі. Гэта адзнака - 10. Магу з упэўненасцю сцвярджаць, што праца і намаганні ў школьны час былі зусім не дарэмнымі. І хачу, каб мае словы былі нейкім стымулам для больш інтэнсіўнай падрыхтоўкі да ЦТ у сённяшніх адзінаццацікласнікаў. Хаця б для таго, каб не сутыкнуцца з расчараваннем: не хапіла аднаго ці двух балаў... Студэнцкае жыццё проста выдатнае. Паважаныя абітурыенты, чакаем вас у нашых радах!





(Працяг на стар. 5).

# УСПАМІНЫ, ШТО САГРАВАЮЦЬ

***Лета - гэта выдатная пара, якая адкрывае перад намі шэраг магчымасцей і шанцаў. Час падарожжаў, адпачынку і вольнага часу. Для нас, адзінаццацікласнікаў, гэта было «апошняе» бесклапотнае лета. Чакаюць будучых выпускнікоў вызначальныя для лёсу экзамены - і расслабляцца ўжо некалі, але ёсць успаміны, што яшчэ доўга будуць саграваць нашу душу.***



**Дзіяна ПАДДУБСКАЯ, 11 «А»:**

- Лета я правяла добра, нават выдатна. Хадзіла з сям'ёй у паход, некалькі разоў ездзіла ў парк забаў, часта - на святы ў розныя гарады. Таксама выдарылася магчымасць трапіць у профільны лагер «Эрудыт», дзе я знайшла новых сяброў, атрымала масу станоўчых эмоцый і, вядома ж, назапасіла шмат новых ведаў. Вельмі шчаслівая, што пабывала ў Санкт-Пецярбурзе.

**Таццяна ДАЎГУЧЫЦ, 11 «Б»**

- Летам я ездзіла ў іншыя гарады да сяброў і сваякоў у госці. Было вельмі цудоўна! Мы хадзілі на раку і ў лес. У канцы лета з сям'ёй ездзілі на адпачынак. Шкада, што бесклапотная пара так хутка скончылася.

**Аляксей АЛЬФЕР, 11 «А»:**

- Гэта было апошняе лета перад экзаменамі. Вядома, яго было мала, аднак час прайшоў цудоўна і з карысцю! Будаўнічая брыгада, прагулкі з дзяўчынай, сустрэчы з сябрамі і мора пазітыву!

**Вікторыя МІГЕЛЬ, 11 «Б»:**

- У чэрвені я была на аздараўленні ў санаторыі ў Налібоцкай пушчы. Потым паляцела ў Італію. Там я ездзіла ў горы на тыдзень, было вельмі цікава, даведалася шмат новага. Яшчэ я наведала сусветную выставу і ўбачыла, якія экспанаты прадставіла там наша краіна.

**Надзея ДЗЕМЕШ, 11 «Б»:**

- Лета пачалося з адпачынку і дапамогі школе. Рака Бярэзіна, Мінскае мора… Засталося шмат добрых фатаграфій і незабыўных ўражанняў. Таксама я ездзіла ў Гомель і пазнаёмілася з яго славутасцямі.

**Успаміны збірала Яўгенія ГАЛУЗА**

# ПАЛЁТ У ЖЫЦЦЁ

(Працяг. Пачатак на стар. 2-3).

**Аляксей НЕСЦЯРОВІЧ:**

- Я паступіў у Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт. У мяне маса ўражанняў: выдатныя група і выкладчыцкі склад, добрая матэрыяльная база, ну і ў дадатак - я СТАРАСТА. Вучыцца несумненна цяжка, але цікава: многія прадметы бяруць у палон яшчэ на першых парах, ну і натуральна, калі ты хочаш выйсці высокапрафесійным спецыялістам, то давядзецца прыкласці намаганні. Асабіста для мяне самы вялікі плюс - гэта вывучэнне лацінскай мовы, ну і яшчэ падабаецца тое, што ў будучым можна скарыстаць усе веды на практыцы, а вывучэнне чалавечага цела – займальная рэч. Абраў менавіта гэты вуз, таму што ён лічыцца прэстыжным у Беларусі і нават за яе межамі.

**Марыя МІКУЛЬЧЫК:**

- Я паступіла ў МДЛУ. Страшэнна тут падабаецца, бо я так даўно пра гэта марыла. Пакуль асаблівай нагрузкі няма, але цяжкавата мяняць гаворку. Жыццё тут кіпіць, сумна не бывае. Мая дзіцячая мара здзейснілася - і я шчаслівая. Вучыцца пакуль няцяжка: у нас сем тыдняў уступнага курса.

**Алена ЦЭНКЕЛЬ.**
**Фота з архіва.**

***У ГАСЦЯХ У ПСІХОЛАГА***

## ТЭСТ - «НАСТРОЙ»

**Падчас доўгай тэлефоннай размовы рука сама пачынае выводзіць на паперы розныя ўзоры, тварыкі або геаметрычныя фігуры. Прыгледзьцеся да іх уважліва. Лічыцца, што падобныя малюнкі - пасланні нашай падсвядомасці, здольныя многае расказаць аб стане і настроі чалавека на дадзены момант.**

**КВЕТКІ, СОНЦА** выдаюць адчувальную натуру. Могуць таксама выказваць утоеную патрэбу ў любові, сяброўстве і пяшчоце.

**СЭРЦАЙКІ** – сімвал ранімых і ўражлівых асоб. Чым больш сэрцаў на малюнку, тым больш у чалавека эмацыйных узрушэнняў і праблем, што хвалююць яго душу.

**Алена КУЗІНА,**
*псіхолаг*

***ПРОБА ПЯРА***



**ОДНИМ СЛОВЕЧКОМ**

***Одним словечком – обожаю,***
***Люблю, пишу я, сочиняю…***
***Вдохновенье – лучший друг,***
***Посмотри, стихи вокруг.***
***И это красота,***
***Её запомни навсегда!***

**Елизавета ВОЙТЕХОВИЧ, 9 «Б» класс**

# ПРОСТАЕ ШЧАСЦЕ ЛЮДСКОЕ...

| | Што такое шчасце? | Якога чалавека можна назваць шчаслівым? |
|---|---|---|
| **Марыя КРАЎЧАНКА, 11“Б”** | Гэта калі адзінота займае малую частку жыцця. Калі ёсць каханы чалавек, які падтрымлівае. | Які не турбуецца наконт жыццёвай дзейнасці. |
| **Яўгенія ГАЛУЗА, 11 “Б”** | Калі табе ўжо шмат год, а ты здаровы. Ты бачыш, як растуць твае ўнукі. Калі ёсць здароўе, то ёсць і шчасце. | Чалавек, у якога ёсць сям’я, здароўе, сябры. |
| **Вікторыя МІГЕЛЬ, 11 “Б”** | Калі ў дзяцей ёсць бацькі, якія іх любяць. | Дзеці, якія жывуць з бацькамі. |
| **Надзея ДЗЕМЕШ, 11 “Б”** | Калі бацькі любяць, дапамагаюць і клапоцяцца пра цябе. Калі дарагі сэрцу чалавек цябе кахае. | Які здольны любіць і кахаць. |
| **Кацярына РОГАВА, 11 “Б”** | Шчасце – мае бацькі, якія падарылі мне жыццё. | Чалавек, які задаволены тым, што мае. |



# У КОЖНЫМ ДЗІЦЯЦІ ЁСЦЬ СОНЦА, ТОЛЬКІ ДАЙ ЯМУ СВЯЦІЦЬ!



Для таго, каб запаліць сонца ў душы дзіця, трэба толькі трохі пастарацца: навучыць яго ўсяму таму, што ўмееш рабіць сам, развіць у ім любоў да кніг, да вучобы і ўсяго жывога.

У гэтым навучальным годзе да нас у школу прыйшла на працу настаўніца пачатковых класаў Любоў Мікалаеўна МІХАЛЁВА, і менавіта ёй трэба будзе ўсяму гэтаму навучыць сваіх першакласнікаў.



Мы пагутарылі з Любоўю Мікалаеўнай і даведаліся, што школа педагогу вельмі падабаецца; дзеткі, якія прыйшлі ў першы клас, вясёлыя, рухомыя і вельмі таварыскія. Яны любяць спяваць, маляваць, слухаць казкі, заняткі фізічнай культурай. Вучні заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу адзін аднаму і настаўніцы. А таксама кожны дзень прыходзяць у школу з задавальненнем.

Смешны народ – гэтыя першаклашкі!

**Яўгенія ПОВАРАВА**



# СПОРТ – У ТРЭНДЗЕ! А ТЫ?

*12 верасня ў школе адбыўся Дзень здароўя. Свята праходзіла на вуліцы. Дзеці, захапляючыся цёплым, сонечным восеньскім надвор’ем, радасна і актыўна ўдзельнічалі ў мерапрыемстве. Спартыўнае свята “Вас выклікае спартландыя” было прысвечана пачатку навучальнага года. Вучні другога класа былі задзейнічаны ў спартыўных народных гульнях на стадыёне. Чацвёртакласнікі паказалі сваю кемлівасць і знаходлівасць у інтэлектуальнай гульні па правілах дарожнага руху. Старшакласнікі беглі восеньскі лёгкаатлетычны крос, гулялі ў футбол, валейбол. А вось вучні 5-7 класаў спаборнічалі падчас праходжання займальных этапаў “Вясёлай спартландыі”. Нягледзячы на вялікую канкурэнцыю, перамагла каманда 6 «А» класа!*

*Мэта падобных свят: прапаганда здаровага ладу жыцця сярод падрастаючага пакалення. Вельмі важна, пачынаючы з самага ранняга ўзросту, выхоўваць у дзяцей актыўнае стаўленне да ўласнага здароўя, разуменне таго, што яно - самая найвялікшая каштоўнасць, падараваная чалавеку прыродай.*

*Наша будучыня - у нашых руках. Каб яна была прыгожай, шчаслівай, трэба весці здаровы лад жыцця. А гэта пад сілу кожнаму з нас: “невыкарыстанне” алкаголю, цыгарэт, наркотыкаў; рэгулярныя заняткі фізічнай культурай, разумовая і фізічная праца. Проста трэба выхоўваць у сабе ўстойлівую звычку да захавання здаровага ладу жыцця.*

**Надзея МІХАЛЁВА,** ***настаўніца беларускай мовы і літаратуры***

# ШОСТЫ ДЗЕНЬ

















ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»
ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА
ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by
Сайт: berezino2.schools.by
Клуб «Юны журналіст»